Список литературы:
1. Шакура, С. Д. Образовательное путешествие: формируем у учащихся метапредметные компетенции / С. Д. Шакура // Нар.асвета. – 2018. – № 8. – С. 11-14.
2. Авраменко А.А., Хмелёва А.А., Крапивина Л.А. Математика в различных профессиях // Международный студенческий научный вестник. – 2020. – № 2. – С. 141-141;
3. URL: https://eduherald.ru/ru/article/view?id=20043 (дата обращения: 28.03.2023).

## ВЫКАРЫСТАННЕ КРАЯЗНАЎЧАГА МАТЭРЫЯЛУ ЯК СРОДАК ПАВЫШЭННЯ ЭФЕКТЫЎНАСЦІ НАВУЧАННЯ І ВЫХАВАННЯ

**А. А. Пікулік, настаўнік пачатковых класаў**
*ДУА "Аснежыцкая сярэдняя школа Пінскага раёна", Рэспубліка Беларусь*

Кожны чалавек любіць тое месца, дзе ён нарадзіўся і жыве. Гэтае месца і ёсць родны край. Ніколі не забываецца свой дом. Заўсёды помніцца дарога ў школу, вёска. Адсюль, ад роднага парога роднай хаты пачынаецца любоў да сваёй Радзімы.

Сваю работу я кожны раз пачынаю з 1 верасня, з першага класа кожнага набора. Таму што малодшыя школьнікі, павінны ведаць, паважаць гісторыю сваёй малой радзімы. Гэта вобраз края, дзе ты жывеш. Што такое Радзіма?

Радзіма, як я расказваю дзецям, – гэта краіна, дзе ты жывеш; хата, дзе нарадзіўся; бярозка, каля роднага ганка; месца, дзе жылі твае продкі, сцяжынка, па якой вучыўся хадзіць. Гэта ўсё разам узятае і лічыцца радзімай – гэтае тваё роднае месца.Я лічу, што далучэнне ў вучэбны працэс праграмнага матэрыялу і матэрыялу краязнаўчага характару адкрывае новыя магчымасці для развіцця

малодшых школьнікаў, фарміраванне ў іх агульнакультурных і агульначалавечых каштоўнасцей, патрыятычных адносін да свайго роднага краю, садзейнічае развіццю пазнаваўчай цікавасці, больш свядомаму засваенню ведаў.

Вывучэнне краязнаўчага матэрыялу ў школе, асабліва ў пачатковых класах, садзейнічае выхаванню ў навучэнцаў гордасці за сваю малую радзіму і ўсю краіну наогул. Краязнаўчы матэрыял даступны навучэнцам для засваення, дазваляе на канкрэтных прыкладах расказаць і нават паказаць дасягненні роднага краю, малой радзімы, усёй краіны ў цэлым, раскрыць пераемнасць культурных традыцый і вызначыць месца роднага краю ў айчыннай і міравой культуры.

Практычна на любым вучэбным прадмеце ў пачатковай школе, пры жаданні, магчыма выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу, звязанага з малой радзімай. Найбольшая эфектыўнасць прымянення такога матэрыялу, на мой погляд, дасягаецца пры ўзаемадзеянні вучэбных заняткаў, пазакласнай і гуртковой работы.

Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу ў адукацыйным працэсе на ўроках “Мая радзіма – Беларусь” садзейнічае развіццю пазнаваўчага інтарэсу вучняў да малой радзімы, а таксама вывучэння вучэбнага прадмета, што з’яўляецца стымулам для засваення трывалых ведаў.

Мяне заўсёды цікавілі ўнікальныя звесткі пра малую радзіму, родны край.

Падбіраю і выкарыстоўваю краязнаўчы матэрыял на вучэбных занятках з ўлікам наступных умоў: 1) уся інфармацыя, факты павінны быць, па магчымасці, яркімі, эмацыянальна насычанымі, вызываць пазнаваўчую цікавасць навучэнцаў да вывучэння роднага краю; 2) паняцці, звесткі па гісторыі, прыродзе роднага краю павінны адпавядаць узроставым асаблівасцям навучэнцаў, быць для іх даступнымі, зразумелымі і значнымі; 3) пры выкарыстанні краязнаўчага матэрыялу павінна захоўвацца пераеемнасць.

Аб тым, што нашы дзяды з павагай ставіліся да ўсяго кроўнага, сведчаць шматлікія творы вуснай народнай творчасці, асабліва казкі, легенды, паданні, а таксама шэдэўры мастацкай літаратуры. Творчы набытак народнай памяці і чалавечай дасканаласці можа з надхненнем пасеяць настаўнік не толькі на вучэбных занятках, але і ў пазакласнай і пошукавай працы.

Зрабіўшы аналіз вучэбнай праграмы па прадмету “Чалавек і свет” для 2-4 класаў, адзначыла, на якіх вучэбных занятках мэтазгодна выкарыстоўваць краязнаўчы матэрыял. Вучэбны прадмет “Чалавек і свет” дае вялікія магчымасці для выкарыстання краязнаўчага матэрыялу.

Пры знаёмстве з тэмай “У краіне майстроў” навучэнцы знаёмяцца з майстрамі-вышывальшчыцамі аснежыцкай зямлі. З майстрам лазапляцення, які пражывае ў аграгарадку Аснежыцы.

У нашай школе створана Дрэва-каляндар лапікавых лялек. Вучні знаёмяцца не толькі з забавамі бабуль, даведваюцца пра стварэнне лапікавых лялек, разнастайнасцю відаў і іх прымянення ў жыцці нашых продкаў. Але могуць з імі пагуляць, таму што распрацаваны гульні, дзе вучні даведваюцца і пра традыцыі, звязаныя з пэўнай лялькай.

Пры вывучэні тэмы “Ад батлейкі да тэатра” вучні знаёмяцца з гісторыяй аснежыцкай батлейкі. Яе знаёмству папярэднічае матывацыйная гутарка з уласнага вопыту, якая ўключае ў сябе наступныя пытанні:

- Хто з вас быў у тэатры? Як называецца тэатр, дзе вы былі? (Вельмі часта з навучэнцамі наведваем Палескі драматычны тэатр. Імкнемся не прапусціць ніводнай прэм’еры для дзяцей.)

- Што ўяўляе сабой тэатр?

- А зараз паглядзіце, які тэатр існаваў раней у нашай вёсцы?

Пры вывучэнні тэмы “Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны” навучэнцы знаёмяцца з ветэранамі Вялікай Айчыннай вайны, якія пражывалі на тэрыторыі Аснежыцкага сельвыканкама, знаёмяцца з фільмам “Места памяти Оснежицкого сельисполкома”, створаным бацькамі вучаніцы нашай школы, дзе даведваюцца пра лёс вёскі Любель-Поль, месцам растрэлу

мірных жыхароў; помнікам-абеліскам у вёсцы Пасянічы; месцам захаранення больш 8 тыс. жыхароў яўрэйскай нацыянальнасці; месцам першага бою Пінскага партызанскага атрада Героя Савецкага Саюза В.З. Каржа; помнікам-ахвярам фашызма ў весцы Добрая Воля; вёскай Любель, месцам растрэлу мірных жыхароў.

На вучэбным занятку па тэме “Багацце нашай краіны” дзеці знаёмяцца з гісторыяй калгаса Аснежыцкі, слава пра які грымела на ўвесь Савецкі Саюз, з жыццём чалавека-легенды Уладзіміра Антонавіча Ралько. Вельмі цікава праводзіць экскурсію ў музеі калгаса Аснежыцкі сучасны дырэктар ААТ Аснежыцкае В.А. Кулішэвіч. Яго лёс таксама з’яўляецца прыкладам для падражання. Хлопчык з самай звычайнай сялянскай сям’і стаў дырэктарам ААТ, чалавекам пра якога даведаліся, але і ведаюць не толькі ў вобласці, але і ў рэспубліцы. (Ёсць фільм “7 цудаў аграгарадка Аснежыцы”, створаны бацькамі вучаніцы).

А на ўроку “Тут мінуўшчына з сучаснасцю сышліся” з вучнямі здзяйсняем экскурсію на станцыю “Дружба” ААТ “Гомельтранснафта Дружба”. Сваімі вачыма вучні бачаць доўгі шлях нафты, знаёмяцца з прафесіямі, якімі валодваюць супрацоўнікі станцыі.

Веды вучняў будуць значнымі, калі іх звязаць з краязнаўчым матэрыялам, які звязаны з іх малой радзімай, славутымі землякамі. А калі перад вачыма асабісты прыклад бацькоў – гэта ў разы павышае зацікаўленасць саміх дзяцей. Так намаганнямі бацькоў былі створаны фільмы: “7 цудаў аграгарадка Аснежыцы”і “Места памяти Оснежицкого сельисполкома”.

Кожны вучэбны год у школе праходзіць тыдзень краязнаўства. На працягу тыдня вучні бачаць, які багаты матэрыял назапашаны, якая вядзецца работа па вывучэнню гісторыі малой радзімы, Піншчыны, Рэспублікі Беларусь. І нам ёсць чым ганарыцца. Ужо на працягу 10 гадоў вучні нашай школы становяцца пераможцамі рэспубліканскіх, абласных і раённых конкурсаў. Менавіта намаганнямі школьнікаў, створана інтэрактыўная карта

аграгарадка Аснежыцы, інтэрактыўная карта помнікаў на тэрыторыі Аснежыцкага сельскага выканкама.У рамках тыдня праходзіць прэзентацыя “Наш аснежыцкі, родны край”, квізы “Што ты ведаеш пра наш аграгарадок” і “Хайпуем па-Аснежыцку”, конкурс малюнкаў “Мы тут жывём”, конкурс замалёвак “Мой аграгарадок”, знаёмства з даследчымі работамі, якія праводзяцца ў пазаўрочны час, сустрэчы са знакамітымі землякамі.

Прааналізаваўшы сваю дзейнасць і вынікі работы я стала прымаць удзел у краязнаўчых выставах метадычных матэрыялаў, а яшчэ зрабіла вывад, што выкарыстанне краязнаўчага матэрыяла на ўроках вызывае ў навучэнцаў больш цікавасці да малой радзімы, садзейнічае больш трываламу засваенню ведаў пра малую радзіму, родны край і пра ўсю Беларусь.

Выкарыстанне прапанаванага вопыту патрабуе ад настаўніка пачатковых класаў сістэмнага падыходу ў рабоце па фарміраванню грамадскага-патрыятычных якасцей. Неабходна ўлічваць узроставыя і індывідуальныя асаблівасці навучэнцаў, выкарыстоўваць разнастайныя формы работы як на ўроках, так і ў пазакласнай дзейнасці, прычым рабіць акцэнт на тых формах, якія зробяць і вучэбны занятак, і мерапрыемства яркімі, запамінальнымі, на якіх навучэнцы атрымаюць не толькі карысную інфармацыю, але змогуць праявіць сябе ў розных відах дзейнасці. Найбольш удалымі будуць нестандартныя ўрокі,  экскурсіі, падарожжы. І хаця гэтыя формы работы патрабуюць шмат часу ў арганізацыі і правядзенні, але яны з’яўляюцца найбольш эфектыўнымі ў дасягненні неабходных вынікаў. У кожнай вёсачцы, аграгарадку ёсць магчымасць знайсці сваю “рызынку”, штосьці адметнае ад іншых мясцін. А калі ты яшчэ і мясцовы жыхар, ведаеш амаль усіх жыхароў, ды і цябе ведаюць з малых гадоў: цяжкасцей у зборы матэрыялу будзе значна менш.

Мае напрацоўкі могуць выкарыстоўвацца ў агульнаадукацыйнай установе настаўнікамі пачатковых класаў і выхавальнікамі групы падоўжана дня, педагогамі дадатковай адукацыі пры арганізацыі вучэбна-выхаваўчага

працэсу з навучэнцамі па выпрацоўцы ў іх грамадскага-патрыятычных якасцей.

Выкарыстанне краязнаўчага матэрыялу на вучэбных занятках па вучэбных прадметах садзейнічае развіццю пазнаваўчай цікавасці навучэнцаў, выхаванню патрыятызму, павагі да роднага краю, фарміраванню пачуцця гордасці за сваю Радзіму.

Умова поспеху – выкарыстанне розных відаў краязнаўчага матэрыялу ў сукупнасці, апора на метапрадметныя сувязі, тэхнічнае забеспячэнне кабінета на сучасным узроўні.

Мае метадычныя напрацоўкі абмежаваны рамкамі аграгарадка Аснежыцы Пінскага раёна, таму большую частку матэрыялу могуць выкарыстаць настаўнікі Піншчыны.

Матэрыялы да ўрокаў могуць быць цікавымі настаўнікам другіх рэгіёнаў, педагогам дадатковай адукацыі, якія займаюцца краязнаўчай работай, выкарыстаны як пазнаваўчы матэрыял пры вывучэнні пэўных тэм пра прыроду, славутасці і знакамітых людзей Беларусі.

Спіс літаратуры:

1. Буткевіч В.В.Патрыятычнае выхаванне вучняў: гісторыя і сучаснасць: Дапаможнік для настаўнікаў агульнаадукацыйных устаноў. /Буткевіч В.В. -Мн: Нац. ін-т адукацыі, 2010.-123с.

# ГРАЖДАНСКО-ПАТРИОТИЧЕСКОЕ ВОСПИТАНИЕ: ТРАНСФЕР ПЕДАГОГИЧЕСКОГО ОПЫТА

**О. Н. Симонович, заместитель заведующего по основной деятельности**
*ГУО «Плещицкий детский сад Пинского района», Республика Беларусь*

В соответствии с Концепцией непрерывного воспитания детей и учащейся молодёжи в Республике Беларусь одним из основных